**ПАЖАНЫЯ НАВУЧЭНЦЫ ВЫПУСКНЫХ КЛАСАЎ, ПЕДАГОГІ І БАЦЬКІ!**

***У 2023-2024 навучальным годзе Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны праводзіць універсітэцкую алімпіяду для навучэнцаў выпускных класаў.***

Дзякуючы гэтаму перад будучымі выпускнікамі адкрываюцца **наступныя магчымасці:**

*Пераможцы (дыпломы I, II, III ступені) універсітэцкай алімпіяды па* ***беларускай мове і літаратуры*** *маюць права быць залічанымі* ***без экзаменаў*** *на спецыяльнасць* ***6-05-0232-01 «Беларуская філалогія»*** *(кваліфікацыя* ***«Філолаг. Выкладчык»)*** *ва* ***УА«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны».***

**Філолаг** – гэта спецыяліст, які вывучае мовы (іх гісторыю, будову, структуру) і літаратуру (як беларускую, рускую, так і замежную). Філалагічны факультэт УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» чакае ўсіх, хто любіць слова, марыць быць выкладчыкам, журналістам, рэдактарам, паэтам ці пісьменнікам, даследчыкам мовы і літаратуры, перакладчыкам. Гэтае месца, дзе студэнты знаходзяць усё неабходнае для паўнавартаснай асобаснай, творчай і прафесійнай самарэалізацыі.

**Сферы прафесійнай дзейнасці:**

– выдавецкая дзейнасць;

– дзейнасць па стварэнні праграм радыё і тэлевяшчання;

– дзейнасць інфармацыйных агенцтваў і іншыя віды інфармацыйнага абслугоўвання;

– навуковыя даследаванні і распрацоўкі;

– сярэдняя адукацыя;

– вышэйшая і паслясярэдняя адукацыя;

– дадатковая адукацыя;

– дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

**Навучанне на філалагічным факультэце ГДУ імя Ф. Скарыны мае шэраг пераваг:**

– высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі састаў, які паспяхова спалучае выкладчыцкую і навуковую дзейнасць;

– наяўнасць студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, кабінетаў польскай мовы, кітаязнаўства, Скарынаўскага кабінета, Рэгіянальнага цэнтра русістыкі, літаратурна-асветніцкага цэнтра «Патрыётыка», лінгафоннага

кабінета, кабінета лінгвакультуры, літаратурнага музея «Alma-Mater», Цэнтра навучання кітайскай мове;

– акадэмічная мабільнасць;

– магчымасць стажыроўкі і працаўладкавання па спецыяльнасці з трэцяга курса, навучання па індывідуальным графіку;

– выніковы ўдзел у навукова-даследчай рабоце, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах і конкурсах, канферэнцыях;

– магчымасць атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі (магістратура) і другой вышэйшай адукацыі ў Інстытуце дадатковай адукацыі ГДУ імя Ф. Скарыны.

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

Алімпіяда абітурыентаў па беларускай мове і літаратуры праходзіць у два этапы.

*Першы(папярэдні) этап праходіць дыстанцыйна (27 снежня 2023 года).* Да ўдзелу дапускаюцца ўсе навучэнцы выпускных класаў, якія прайшлі рэгістрацыю і атрымалі лагін і пароль. Заданні ўключаюць 30 тэставых пытанняў закрытага тыпу, якія правяраюць базавыя веды па беларускай мове і літаратуры. На выкананне работы ўдзельнікам адводзіцца **120 хвілін**.

*Другі (заключны) этап алімпіяды праводзіцца вочна на базе ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» (люты 2024 года).*

Да другога этапа дапускаюцца ўдзельнікі, якія ў ходзе выканання заданняў першага (папярэдняга) этапа пераадолелі кваліфікацыйны мінімум (на падставе рэйтынгу набраных балаў). Заданні для ўдзельнікаў другога (заключнага) этапа алімпіяды па беларускай мове і літаратуры будуць уключаць 10 заданняў адкрытага тыпу (7 заданняў па мове і 3 заданні па літаратуры). На выкананне работы ўдзельнікам другога (заключнага) этапа адводзіцца **180 хвілін**.

Пераможцамі і прызёрамі алімпіяды лічацца ўдзельнікі, якія набралі найбольшую сумарную колькасць балаў і ўзнагароджаны дыпломамі I, II і III ступені.

***Дыпломы даюць права быць залічанымі БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ на бюджэтную дзённую форму навучання па спецыяльнасці «Беларуская філалогія» на філалагічны факультэт УА «ГДУ імя Ф. Скарыны».***

**Кантактная інфармацыя:** 246028 г. Гомель, вул. Савецкая, 108
**тэл.** 8(0232) 51-21-36 (Палуян Алена Мікалаеўна)
**e-mail** poluyan@gsu.by